**П А С Т А Н О В А** **П О С Т А Н О В Л Е Н И Е**

13.07.2011 №69

Аб некаторых пытаннях вывучэння моў асобнымі катэгорыямі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця

На падставе пунктаў 3 і 5 артыкула 90 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Пры атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі вывучэнне беларускай і рускай мовы не з'яўляецца абавязковым для асоб з парушэннем слыху (якія не чуюць або слаба чуюць са стратай слыху ў межах 70-90 дэцыбелаў) і асоб з цяжкімі парушэннямі маўлення.

Пры атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі вывучэнне адной з замежных моў не з'яўляецца абавязковым для асоб з парушэннем слыху, якія навучаюцца ў другім аддзяленні спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы (спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната) і асоб з цяжкімі парушэннямі маўлення.

2. Адукацыйны працэс пры атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцамі з парушэннем слыху (якія не чуюць або слаба чуюць са стратай слыху ў межах 70-90 дэцыбелаў) у спецыяльных агульнаадукацыйных школах (спецыяльных агульнаадукацыйных школах-інтэрнатах), установах агульнай сярэдняй адукацыі, іншых арганізацыях, індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі (далей, калі не ўстаноўлена іншае, - установа адукацыі), з беларускай мовай навучання арганізуецца на беларускай (пісьмовая, вусная, дактыльная формы) і жэставай мовах.

Адукацыйны працэс пры атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцамі з парушэннем слыху (якія не чуюць або слаба чуюць са стратай слыху ў межах 70-90 дэцыбелаў) ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання арганізуецца на рускай (пісьмовая, вусная, дактыльная формы) і жэставай мовах.

3. Адукацыйны працэс пры атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцамі з цяжкімі парушэннямі маўлення ва ўстановах адукацыі з беларускай мовай навучання арганізуецца на беларускай мове.

Адукацыйны працэс пры атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцамі з цяжкімі парушэннямі маўлення ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання арганізуецца на рускай мове.

4. Вывучэнне беларускай або рускай мовы пры атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцамі, якія азначаны ў частцы першай пункта 1 дадзенай пастановы, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з вучэбным планам другога аддзялення спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы (спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната) для дзяцей з парушэннем слыху або вучэбным планам спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы (спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната) для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення адпаведна.

5. Вывучэнне адной з замежных моў пры атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцамі з парушэннем слыху, якія навучаюцца ў другім аддзяленні спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы (спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната), і навучэнцамі з цяжкімі парушэннямі маўлення ажыццяўляецца па іх жаданні.

Вывучэнне адной з замежных моў навучэнцамі, якія азначаны ў частцы першай дадзенага пункта, ажыццяўляецца за кошт вучэбных гадзін, якія вызначаны на правядзенне факультатыўных заняткаў.

6. Пры атрыманні прафесіянальна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адначасовым атрыманнем агульнай сярэдняй адукацыі вывучэнне беларускай мовы не з'яўляецца абавязковым для навучэнцаў з парушэннем слыху (якія не чуюць або слаба чуюць са стратай слыху ў межах 70-90 дэцыбелаў) і навучэнцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення, якія навучаліся ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання.

Пры атрыманні прафесіянальна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адначасовым атрыманнем агульнай сярэдняй адукацыі вывучэнне рускай мовы не з'яўляецца абавязковым для навучэнцаў, якія азначаны ў частцы першай дадзенага пункта і якія навучаліся ва ўстановах адукацыі з беларускай мовай навучання.

7. Вывучэнне адной з замежных моў пры атрыманні прафесіянальна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адначасовым атрыманнем агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцамі з парушэннем слыху, якія навучаліся ў другім аддзяленні спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы (спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната) і навучэнцамі з цяжкімі парушэннямі маўлення ажыццяўляецца па іх жаданні.

8. Пры атрыманні прафесіянальна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі вывучэнне беларускай мовы не з'яўляецца абавязковым для асоб з парушэннем слыху (якія не чуюць або слаба чуюць са стратай слыху ў межах 70-90 дэцыбелаў) і асоб з цяжкімі парушэннямі маўлення, якія навучаліся ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання.

9. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

Міністр С.А. Маскевіч